# КАРАТКЕВІЧ
# ДЗМІТРЫЙ АНДРЭЕВІЧ



Нарадзіўся 16 кастрычніка 1904 года ў вёсцы Дроздава Азерацкага сельсавета. Член КПСС з 1928 года. Працаваў старшынёй сельсавета, узначальваў раённаю прафсаюзную арганізацыю. У 1931-1935 гадах працаваў міліцыянерам у Мінску і Мінскай вобласці. Пасля заканчэння ў 1937 годзе Рэспубліканскай партыйнай школы працаваў першым сакратаром Заслаўскага райкома КП(б)Б. У 1938-1940 гадах – член ЦК КП(б), начальнік Галоўгандлю БССР, у 1940-1941 гадах – дырэктар Мінскага прамгандлю.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёў падпольную работу ў Мінску, быў членам Мінскага гарадскога падпольнага камітэта КП(б)Б, кіраваў аддзелам разведкі. У 1942 годзе гітлераўцы натрапілі на след партыйнага цэнтра. Караткевіч і многія іншыя падпольшчыкі былі арыштаваны. Пасля працяглых катаванняў пакараны ў пачатку 1943 года праз павешанне на стадыёне "Дынама". Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

Адна з вуліц у Мінску носіць імя Д.А. Караткевіча.

**Крыніцы інфармацыі:**


1. **Герои подполья.** О подпольной борьбе советских патриотов в тылу нем.-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. – Вып. 1. – 3-е изд., испр. и доп. – Москва : Политиздат, 1970. – 559 с. с ил.

2. **Шнэйдар, А.А.** Імем земляка / Анатоль Шнэйдар // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1988. – С. 235.

3. **Карточка "Дороги памяти" на Дмитрия Короткевича.** – Память народа : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : poisk.re›way/595152.


FREE-OFFICE.NET